вым ресурсам, за контроль над территорией и ее природными богатствами, и, наконец, за политический суверенитет. Чем более блестящим представляется народу его прошлое, тем с большей настойчивостью он склонен претендовать на значительную политическую роль в современном мире. Националистическая или этноцентристская историческая версия играет огромную роль в легитимизации политических претензий или уже имеющихся политических прав – и в этом состоит ее глубокий внутренний смысл.

Другой российский исследователь, Александр Севастьянов, представляет национализм как своевременное и необходимое в данных исторических реалиях явление. Он приводит цифры, свидетельствующие о росте националистических настроений среди россиян (лозунг «Россия для русских!» в 1998 г. поддерживало 43 % населения, а в 2003 – 61 %) [2] и в связи с этим делает вывод, что государство должно проводить политику, поддерживаемую народом. Он считает, что необходимо правильное понимание значения данного термина. Сам Севастьянов дает следующее определение: «на индивидуальном уровне это любовь к своему народу и забота о нем. Но на массовом уровне это инстинкт самосохранения нации, который молчит, когда все благополучно, но просыпается, когда народу грозит опасность» [2]. В своей книге исследователь формулирует доктрину русского национализма с учетом всего трагического опыта XX века – в России и во всем мире.

Таким образом, можно сделать вывод, что национализм является одной из наиболее неоднозначных, провокационных и острых проблем современности и это явление нельзя рассматривать только под одним углом зрения. Игнорирование роста националистических выступлений и общепринятая крайне отрицательная оценка может привести к нежелательным последствиям и вызвать рост межэтнических конфликтов. Поэтому важным является определение природы национализма и путей перевода агрессии в мирное русло.

### Литература


1. *Шнирельман, В.А.* Национальные символы, этноисторические мифы и этнополитика [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.gumer.info/bibliotek_Buks/Polit/Article/schnir_nac_simv.php. – Дата доступа: 01.04.2008.
2. *Севастьянов, А.* Этнополитика и национализм [Электронный ресурс]. Режим доступа http://www.veiesova-sioboda.org/misc/time-to-be-russian-spreech.html. – Дата доступа: 10.04.2008.


## МАСТАЦКІ ВОБРАЗ АРХІТЭКТУРЫ БЕЛАРУСІ АПОШНЯЙ ЧВЭРЦІ XX – ПАЧАТКУ XXI ст.


***Ю.Ю. Захарына**, кандыдат мастацтвазнаўства,*
*загадчык кафедры музыкі і харэаграфіі*


Ацэнка з'яў сучаснасці ўяўляе найбольш складаны і супярэчлівы аспект аналізу з пункту гледжання неадназначных трактовак працэсаў, што адбываюцца ў жыцці грамадства. Мастацкі вобраз дойлідства замацоўвае ў сваім прадметным змесце

форму грамадскага быцця, грамадскай свядомасці, сацыяльныя адносіны грамадства свайго часу. Мастацкі вобраз архітэктуры – эстэтычная характарыстыка матэрыяльна арганізаванага асяроддзя жыццядзейнасці чалавека, якая адлюстроўвае непадзельнае адзінства функцыянальных, канструкцыйна-тэхнічных і эмацыянальна-эстэтычных элементаў, увасобленых у архітэктурных аб'ектах, галоўнымі з якіх з'яўляюцца аб'ём, форма, канструкцыя і дэкор.

Беларуская архітэктура ўяўляе частку еўрапейскай і сусветнай культуры. Яе мастацкі вобраз нясе ў сабе самабытныя якасці і адлюстроўвае ў сваім прадметным змесце еўрапейскія і сусветныя ўплывы, спецыфіка якіх вызначае асаблівасці нацыянальнай школы архітэктуры. Мастацкі вобраз сучаснай беларускай архітэктуры фарміраваўся паслядоўна, паэтапна і ў працэсе эвалюцыі асіміляваў элементы культур еўрапейскіх і іншых народаў свету.

Мастацкі вобраз архітэктуры Беларусі апошняй чвэрці XX – пачатку XXI ст. уяўляе адзінства шматграннасці стылявых, кампазіцыйных, канструкцыйных архітэктурных вырашэнняў пры функцыянальнай зададзенасці. У фарміраванні мастацкага вобраза сучаснай архітэктуры Беларусі вылучаецца некалькі пачаткаў. *Неарацыяналістычны* пачатак сцвердзіўся ў архітэктуры грамадскіх будынкаў і масавым жыллёвым будаўніцтве. Асаблівасці архітэктуры неарацыяналізму вызначылі прынцыпы тэктонікі і манументальнасці. Для пабудоў неарацыяналістычнага кірунку характэрны строгія формы аб'ёмаў-прызм, рытмічная ўпарадкаванасць элементаў і дэталей, якія падкрэсліваюць лагічную выразнасць канструкцыйнага вырашэння, прапарцыянальнасць, прастата знешняга аблічча, вызначаная стрыманасцю дэкаратыўнага аздаблення. Рэфлексія ідэй функцыяналізму, неапластыцызму, канструктывізму ў перыяд панавання неарацыяналізму спрыяла фарміраванню вобраза тыпавых будынкаў і станаўленню стылю «манументальных аб'ёмаў» у грамадскім і прамысловым дойлідстве. Неарацыяналізм сцвердзіў індустрыяльны метад будаўніцтва з выкарыстаннем зборных канструкцый жылых дамоў, які ў многім абмяжоўваў іх мастацкую выразнасць. Пераадоленне манатоннасці і аднастайнасці мастацка-вобразных вырашэнняў жылых пабудоў дасягалася дзякуючы распрацоўцы сілуэтных кампазіцый і ўключэнню ў сістэму аздаблення дэкаратыўных панэлей, вузкіх арнаментальных паясоў, колераваму вырашэнню.

*Рэтраспектыўны* пачатак атрымаў найбольш шырокі спектр праяў у архітэктуры малапавярховых і індывідуальных жылых дамоў, выявіўся ў культавым дойлідстве, грамадскай архітэктуры. Зварот да гістарычнай спадчыны з мэтай запазычання ўзораў форм і элементаў, уласцівых стылям мінулых эпох, для ўзнаўлення ў гарадскім і сельскім асяроддзі спрыяў захаванню нацыянальнай спецыфікі архітэктуры і разнастайнасці мастацкага аблічча пабудоў. Развіццё рэтраспектыўнай тэндэнцыі архітэктуры постмадэрнізму атрымала і крайнія праявы, якія выразіла эклектычная плынь.

*Авангардны* пачатак архітэктуры вызначыла тэндэнцыя да ўскладнення аб'ёмна-прасторавых кампазіцый грамадскіх і жылых будынкаў, вобраз якіх зведаў імкненне да абстракцыі і сімвалізму. Архітэктурныя аб'ёмы розных маштабаў і форм склад-

валіся ў піраміды, прыступкавыя і абстрактныя асіметрычныя прасторава развітыя кампазіцыі або стылізавана ўзнаўлялі вобразы арганічнага свету ці прадуктаў матэрыяльна-тэхнічнай дзейнасці чалавека. Авангардны пачатак уяўляе спалучэнне трох стылявых кірункаў: дэканструктывізму, неамадэрнізму, хай-тэку.

Архітэктура *дэканструктывізму* ўхваляе «прыгажосць хуткасці», дынамічнасць сучаснага жыцця, бесперапыннае, імклівае развіццё тэхнікі. Яе характэрнымі рысамі з'яўляюцца імклівыя лініі, нахілы і зрухі плоскасцей, кансаліраванне верхніх паверхаў, гульня фактур матэрыялаў, колераў. Вобраз пабудоў дэканструктывісцкага кірунку выяўляюць геаметрычныя абстракцыі з аб'ёмаў востравугольных і пластычных абрысаў, якія «лепяцца», нагрувашчваюцца адзін на аднаго, «уразаюцца», «уклейваюцца» ў агульную масу, ствараючы дынамічную кампазіцыю са шматпланавым раскрыццём.

Архітэктура *неамадэрнізму* найбольшай каштоўнасцю сярод сродкаў мастацкай выразнасці абвясціла форму. Вобразы архітэктуры неамадэрнісцкага кірунку ствараліся з наўмысным падкрэсліваннем канструкцыйных асаблівасцей будынкаў. Прадстаўнікі неамадэрнізму развівалі канцэпцыю вобраза-сімвала, якая ўвасаблялася ў праектаванні і будаўніцтве грамадскіх будынкаў на аснове ўзнаўлення стылізаваных прыродных форм у «лёгкіх» канструкцыях з металу і шкла, што імітавалі прыродную матэрыю.

Найбольшае значэнне ў фарміраванні стылявога аблічча архітэктуры найноўшага часу атрымаў *хай-тэк*, які аказаў істотны ўплыў на мастацка-вобразныя вырашэнні дэканструктывісцкага і неамадэрнісцкага кірункаў і сцвердзіў у якасці галоўных сродкаў выразнасці металаканструкцыі і шкло. Архітэктурна-прасторавыя кампазіцыі пабудоў хай-тэку маюць у аснове плаўныя, «цякучыя» лініі абрысаў «паветраных», «светлапразрыстых» аб'ёмаў, «лёгкасць» канструкцыйнага вырашэння якіх не дазваляе характарызаваць іх як статычныя ці манументальныя.

Такім чынам, мастацкі вобраз архітэктуры Беларусі апошняй чвэрці XX – пачатку XXI ст. вызначае сімбіёз неарацыяналістычнага, рэтраспектыўнага і авангарднага (наватарскага) пачаткаў.

## ТЕОРЕТИКО-МЕТОДОЛОГИЧЕСКИЕ АСПЕКТЫ ИССЛЕДОВАНИЯ ИСТОРИИ СОЦИАЛЬНО-ЭКОНОМИЧЕСКОГО РАЗВИТИЯ ОБЩЕСТВА

***С.В. Зенченко**, преподаватель кафедры новой и новейшей истории*

Автор настоящей статьи, посвященной вопросам методологии истории, далек от мысли исчерпать все многообразие проблем, связанных с диалектико-материалистическим подходом к историческому развитию общества. Основная задача работы - проанализировать важнейшие методологические подходы и принципы, связанные с исследованием социально-экономической истории общества.